***В. А. Красулін,*** *канцэртмайстар*
*кафедры этналогіі і фальклору*

# КАРЭЛЯЦЫЯ ДЫДАКТЫКІ ЭФЕКТЫЎНАГА ВЫКЛАДАННЯ ФАЛЬКЛОРУ З АДРАДЖЭННЕМ ТРАДЫЦЫЙНЫХ АБРАДАЎ БЕЛАРУСІ

Падрыхтоўка фальклարыстаў-практыкаў на кафедры Этналогіі і фальклору БДУКМ з'яўляецца ілюстрацыяй становішча, калі дыдактыка эфектыўнага выкладання знаходзіцца ў звязку з дзейнасцю па рэалізацыі на практыцы набытых ведаў, уменняў і навыкаў. Фальклорныя помнікі, зафіксаваныя студэнтамі ў экспедыцыях, – прыдатны дыдактычны матэрыял на занятках і ўзор для рэканструкцыі ў межах дыпломных праектаў. На пачатковых кроках авалодання спецыяльнасцю курсам дацэнта В. В. Калацэя (2007–2012) быў занатаваны валачобны абрад в. Далосцы Бешанковіцкага раёна. Песні і інструментальная музыка былі расшыфраваны і развучаны на занятках па прафілюючых дысцыплінах, а рэканструкцыя абраду стала дыпломным праектам групы.

Даследчык Таццяна Пладунова, методыкай якой карысталіся пры рэалізацыі дыпломнага праекта, выдзяляе наступныя этапы мастацкай рэканструкцыі: даследчы, арганізацыйна-метадычны, вучэбна-рэпетыцыйны, прэзентацыйны, аналітычны [1, с. 128]. Усе яны маюць асаблівасці і накіраваны на тое, каб пры мастацкай рэканструкцыі былі захаваны рэгіянальныя рысы мясцовага свята, стылю выканання музычнага фальклору, каб імпрэза была падрыхтавана без празмерных высілкаў і непатрэбнай мітусні, каб дзеяй была ахоплена аўдыторыя, каб рэканструкцыя прайшла з выхаваўчым і асветным эфектам для мясцовага насельніцтва.

На даследчым этапе быў праведзены збор і пашпартызацыя звестак пра велікодную традыцыю на Падзвінні, яе песенны і этнафанічны складальнікі. Былі даследаваны крыніцы па фальклоры і этнаграфіі, аўдыя- і відэадакументы, паводле якіх была выбрана патрэбная інфармацыя для наступнага аналізу і выкарыстання на практыцы.

На арганізацыйна-метадычным этапе былі адабраны валачобныя песні (з фонаархіваў БДАМ, НАН, прыватных калекцый Т. Пладуновай і В. Калацэя, фальклорных зборнікаў серыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БНК) і дударскія найгрышы (з фонакалекцыі Усерасійскага архіва фонадакументаў, прыватнай калекцыі Б. Гарая), якія падыходзяць па тэкстах, каментарах збіральнікаў да сітуацыі і музычнай часткі.

На вучэбна-рэпетыцыйным этапе далучыліся выкладчыкі кафедры і курс дацэнта В. В. Калацэя. Прэзентацыйны этап праекта быў рэалізаваны 15 красавіка 2012 г. у асяроддзі жыхароў в. Далосцы.

На аналітычным этапе пры дакументаванні і аналізе запісаў велікодных песень, зробленых у 2011 г. у в. Далосцы, працавалі выпускнікі, яны ж былі інжынерамі мультымедыйнага мантажу дыпломнага відэароліка.

Матэрыялы, на якіх вялося выкладанне, былі добра задакументаванымі, а апрацоўвалі іх з дапамогай правераных фалькларыстычных методык. Так, для рэканструкцыі натацыі найгрышу да валачобнай песні за ўзор была ўзята натацыя традыцыйнага славацкага дударскага найгрышу, зробленага Б. Гараем [2]. А пры рэканструкцыі найгрышу да валачобнай песні «Слава таму, хто ў гэтым даму» былі ўлічаны асаблівасці выканання на дудзе, выкарыстоўваліся характэрныя для традыцыі меладычныя прыёмы (мал. 1).



*Малюнак 1. Натацыя найгрышу на дудзе да песні «Слава таму…»*

На занятках дэманстраваліся этнафанічныя ўзоры, якія развучваліся з голасу носьбітаў шляхам шматразовага сінхроннага прапявання з імі (метад дэманстратыўнай антрапатэхнікі). Як метад нагляднага навучання выкарыстоўваліся падрыхтаваныя этнафанічныя транскрыпцыі.

Для ўзбагачэння інструментальнай партытуры свята зроблена ўключэнне ў акампанемент скрыпкі, якая была добра знаёма даласчанам па творчасці мясцовага скрыпача Ануфрыя Казло-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ва. Студэнты ж падрыхтавалі рэканструяваны найгрыш да песні «Слава таму, хто ў гэтым даму» (мал. 2), які выканалі разам з даласчанамі ў час прэзентацыйнага этапу праекта.



*Малюнак 2. Найгрыш на скрыпцы*
*да песні «Слава таму…»*

На аналітычным этапе быў зроблены аналіз мастацка-фальклярыстычнай працы, яе дакументаванне: падрыхтавана інфармацыя ў СМІ (тэлепраграма «Добрай раніцы, Беларусь!» канала «Беларусь 1» ад 16 красавіка 2012 г.); запісаны DVD з аўдыявізуальным дадаткам да дыпломнага праекта «Вялікдзень у Далосцах».

З пералічанага вышэй відавочна, што дыдактыка эфектыўнага выкладання фальклору ў БДУКМ сёння знаходзіцца ў шчыльнай сувязі з дзейнасцю па рэалізацыі студэнтамі на практыцы набытых фальклярыстычных ведаў, уменняў і навыкаў, якія ўвасабляюцца ў форму рэканструкцыі і адраджэння традыцыйных абрадаў Беларусі.


1. *Пладунова, Т.* Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы / Т. Пладунова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 красавіка 2010 г.) ; БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 126–129.

2. *Garaj, B.* Gajdy a gajdošská tradícia na Slovensku / B. Garaj. – Bratislava : ASCO-Ústav hudobnej vedy SAV, 1995. – 277 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ